**UDC: 821.111(73)**

# НЯБАЧНАЕ ПРАЗ БАЧНАЕ: РАМАН ЭНТАНІ ДОРРА «УВЕСЬ НЯБАЧНЫ НАМ СВЕТ»

**Юрый Стулаў**

Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры,
Кафедра замежнай літаратуры
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны універсітэт **(БЕЛАРУСЬ)**,
220034, г. Мінск, вул. Захарава, 21,
e-mail: yustulov@mail.ru

**РЕФЕРАТ**

***Цель.*** Статья посвящена анализу романа современного американского писателя Энтони Дорра «Весь невидимый нам мир», удостоенного Пулитцеровской премии за 2015 г. Целью статьи является выявить художественные стратегии писателя, определившие успех книги. ***Исследовательская методика.*** Для исследования использованы культурно-исторический метод и метод тщательного прочтения, которые позволили выявить авторскую концепцию, нашедшую отражение в выборе главных героев, жанровых характеристиках, способе наррации, оригинальной композиционной структуре романа, интертекстуальных связях. ***Результаты.*** В статье рассмотрены различные оценки романа Дорра, показан его оригинальный подход к показу событий Второй мировой войны через выбор героев, манипуляции с хронотопом, исследование возможностей воздействия на сознание людей при помощи достижений техники, в частности, радио, внимание к «внутреннему» голосу человека, а также влияние травмы на поведение людей в кризисные моменты. ***Научная новизна.*** Роман Э. Дорра «Весь невидимый нам мир» вышел менее двух лет назад и только начинает становиться предметом исследования. Статья направлена на расширение круга новейших произведений, отражающих тенденции в развитии современной американской литературы. ***Практическое значение.*** Данная статья может быть использована для дальнейшего изучения явлений в новейшей литературе США. Научные результаты исследования могут лечь в основу при написании курсовых и дипломных работ.

**Ключевые слова:** современная литература США, хронотоп, жанр романа, интертекстуальность.

# THE INVISIBLE THROUGH THE VISIBLE: THE NOVEL «ALL THE LIGHT WE CANNOT SEE» BY ANTHONY DOERR

**Yuri Stulov**

Ph.D., Associate Professor, Head of the Department,
Department of World Literature,
Minsk State Linguistics University **(BELARUS)**,
220034, Minsk, 21, Zakharava str.,
e-mail: yustulov@mail.ru

**ABSTRACT**

***Aim.*** The paper deals with the novel «All the Light We Cannot See» by the contemporary US writer Anthony Doerr that got the Pulitzer Prize for Fiction in 2015. The aim of the paper is to reveal the author's writing strategies that determined the book's success. ***Methods.*** The cultural-historical method and close reading have been used. They have helped to reveal the writer's concept which found its reflection in the choice of the novel's protagonists, genre characteristics, narrative strategy, original compositional structure, and intertextual links. ***Results.*** Various appraisals of A. Doerr's novel have been discussed. The article shows the writer's innovative approach to showing the events of World War II through the choice of protagonists, manipulations with the chronotop, exploration of the possibilities of affecting people's consciousness with the help of technical innovations, radio in particular, attention to a person's «inner voice» as well as the influence of trauma on

people's behavior in critical situations. ***Scientific novelty.*** The novel «All the Light We Cannot See» by Anthony Doerr was published less than 2 years ago and has not been thoroughly studied yet. The paper is aimed at widening the range of most recent books that show the tendencies in the development of contemporary US literature. ***Practical significance.*** The paper may be used for further study of contemporary US literature. The results of the research can be used for writing course projects and qualification papers.

**Key words**: contemporary US literature, chronotop, genre of the novel, intertextuality.

# НЕЗРИМЕ КРІЗЬ ВИДИМЕ: РОМАН ЕНТОНІ ДОРРА «ВСЕ ТЕ НЕЗРИМЕ СВІТЛО»

**Юрій Стулов**

Кандидат філологічних наук, доцент, завідувач кафедри,
Кафедра зарубіжної літератури,
Мінський державний лінгвістичний університет **(БІЛОРУСЬ)**,
220034, м. Мінськ, вул. Захарава, 21,
e-mail: yustulov@mail.ru

**РЕФЕРАТ**

***Мета.*** Стаття присвячена аналізу роману сучасного американського письменника Ентоні Дорра «Все те незриме світло», відзначеного Пулітцерівською премією за 2015 р. Метою статті є з'ясувати художні стратегії письменника, які обумовили успіх книги. ***Дослідницька методика.*** У студії використані культурно-історичний метод і метод ретельного прочитання, які дозволили виокремити авторську концепцію, втілену у виборі головних героїв, у жанрових характеристиках, у способі наррації, в оригінальній композициційній структурі роману, в інтертекстуальних зв'язках. ***Результати.*** У статті проаналізовані різні оцінки твору Дорра, продемонстровано його оригінальний підхід до зображення подій Другої світової війни через вибір героїв, маніпуляції з хронотопом, дослідження можливистей впливу на свідомість людей за допомогою досягнень техніки, зокрема радіо, увагу до «внутрішнього» голосу людини, а також вплив травми на поведінку людей у кризові моменти. ***Научкова новизна.*** Роман Е. Дорра «Все те незриме світло» опублікований менше двох років назад і тільки починає ставати предметом студіювання. Стаття спрямована на розширення кола новітніх творів, що відображають тенденції розвитку сучасної американської літератури. ***Практичне значення.*** Стаття може бути використана для подальшого дослідження новітньої літератури США, а також при вивченні новітньої американської літератури у виші.

**Ключові слова:** сучасна література США, хронотоп, жанр роману, інтертекстуальність.

Усё больш часу аддзяляе чалавецтва ад падзей Другой сусветнай вайны. Змяняююца пакаленні, амаль не засталося тых, хто прайшоў праз яе цяжар і пакуты. Аднак пісьменнікі ў розных краях зноў і зноў звяртаюцца да тэмы мільёнаў чалавечых трагедый, якія прадэманстравалі як духоўную годнасць чалавека ў гадзіну выпрабаванняў, так і глыбіню падзення. Знакавамі сталі раманы «Чытальнік» Бернхарда Шлінка (1995), «Шарлота Грэй» Себасцьяна Фокса (1999), «Адкупленьне» Іана Мак'юэна (2001), «Змова супраць Амерыкі» Філіпа Рота (2004), «Дабраваліцельніцы» Джанатана Литэлла (2006), «Хлопчык у паласатай піжаме» Джона Бойна (2006), «Жыццё пасля жыцця» Кэйт Эткінсан (2013) і шмат іншых, якія належаць да розных раманных жанраў і дэманструюць розныя падыходы да ваеннай тэмы. Адны абапіраюцца на рэальныя падзеі, іншыя з'яўляюць сабой т. з. «альтэрнатыўную гісторыю»; гераізм подзвіга саступае месца паўсядзённаму жыццю ў нечалавечых умовах, калі кожны момант можа стаць апошнім. Нават у самыя страшныя гады людзі не спынялі барацьбу, бо гэта была барацьба за чалавечую годнасць, за права

заставацца чалавекам. Значна павялічылась колькасць твораў, прысвечаных Халакосту; шмат кніг прысвечана тым, хто, не гледзячы на жах пакарання, ратаваў людзей. А побач – тыя, хто без роздуму выконваў пачварныя загады. Спроба пранікнуць у псіхалогію людзей, якім прыйшлося жыць у гэтую страшную гадзіну, суседнічае з дэтэктывам; драма не выключае гумарыстычных момантаў; гістарычныя асобы змяняюцца звычайнымі, нічым не прыкметнымі персанажамі. Многія з кніг, напісаных на пачатку XXI стагоддзя, адлюстроўваюць новы погляд на вайну пакалення людзей, якія аб вайне ведаюць толькі з кніг і фільмаў. Гэта таксама вызначае як спосаб нарацыі,так і стыль іх твораў, якія адчулі на сябе ўплыў постмадэрнізму з яго рэлятывізмам і зацікаўленасцю ў малых гісторыях замест Вялікай Гісторыі. Дастаткова назваць раман-комікс, альбо графічны раман «Маус» Арта Шпігельмана.

Раману пра Другую сусветную вайну прысвечаны шматлікія дысертацыі, кнігі, артыкулы айчынных і замежных даследнікаў (А. Асоўскі, С. Бялоў, А. Лівергант, Е. Садоўская, В. Судлянкова, Б. Бяргонцы, С. Коларж, С. Фрыдман, С. Хоравітц і інш.), дзякуючы якім творчасць пісьменнікаў, пісаўшых пра вайну, прадстала разнааспектнай, нярэдка супярэчлівай і дае мажлівасць зразумець, чаму гэтая тэма застаецца невычарпальнай.

Адным з самых цікавых і моцных па сіле ўздзеяння стаў раман саракатрохгадовага амерыканскага пісьменніка Энтані Дорра «Увесь нябачны нам свет» (Anthony Doerr. All the Light We Cannot See, 2014), які ў 2015 годзе атрымаў Пулітцэраўскую прэмію і быў узнагароджаны медалём Эндру Карнэгі. На працягу 38 тыдняў кніга была ў спісе бестсэлераў газеты «Нью-Йорк таймс». Раман выклікаў захапленне аматараў кнігі ва ўсім свеце. Адразу пасля яе выхаду ўсе буйнейшыя амерыканскія газэты і часопісы надрукавалі хвалебныя рэцэнзіі, у якіх іх аўтары падкрэслівалі не толькі бліскучае майстэрства пісьменніка, але і арыгінальныя мастацкія хады, дзякуючы якім «Увесь нябачны нам свет» стаў адметнай з'явай у навейшай амерыканскай літаратуры. Крытык найбольш уплывовай амерыканскай газеты «Вашынгтон пост» Аманда Вэйлл вельмі важнай якасцю рамана лічыць адсутнасць якой бы то ні было сентыментальнасці, хоць ён так «займальна і прыгожа напісаны і так эмацыянальна накатвае, што некаторыя эпізоды выклікаюць слёзы» [9][1]. З ёй пагаджаецца дзіцячая пісьменніца Келі Чэрры, якая прызнаецца, што яна «бессаромна плакала над сцэнами жахлівага спусташэння і адчувае, што зноў будзе плакаць, калі ей давядзецца перачытваць кнігу» [4, p. 38]. І расійскі крытык А. Пестарава ўзгадвае, што «апошнія 100 старонак я аблівалася слязамі толькі над вымыслам Энтані Дорра» [7]. Амерыканка Марта Шульман сцвярджае, што пісьменнік «выкарыстаў фізічнае, как зрабіць бачным нябачнае, і стварыў свет, пра які чытачы ведаюць, што гэта фікцыя, але ўсё роўна верацЬ» [8, p. 26].

Між тым ў Расіі ён атрымаў і шмат негатыўных водгукаў у Інтэрнеце, перш за ўсё з-за сцэны з савецкімі салдатамі, якія ўвайшлі ў Германію, а

[1] Усе пераклады з англійскага – аўтар (*Ю. С.*).

таксама ролі, якая адводзіцца англа-амерыканскай арміі пры вызваленні Францыі. Але, на наш погляд, драматычны эпізод з савецкімі салдатамі толькі падкрэслівае крывавы жах вайны, калі пад сумненне ставіцца само паняцце чалавечнасці і годнасці. Што маглі адчуваць на зямлі ворага тыя, у каго фашысты расстралялі родных, знішчылі бацькоўскі дом, пакінулі пасля сябе боль і галечу? У кніжным аглядзе расіянкі Яўгеніі Рыц слушна падкрэсліваецца «пагружанасць аўтара ў матэрыял і …яго адменнае пачуццё гістарычнай стыхіі» [2, с. 208].

Матэрыялы для кнігі збіраліся пад час паездак Дорра ў Еўропу, знаёмства з ваеннымі дакументамі і мемуарамі ўдзельнікаў вайны, а таксама навуковымі кнігамі, якія тычыліся пытанняў марской біялогіі, радыё і слепаты, бо гэтыя тэмы займуць важнае месца ў рамане. Для свайго твора пісьменнік выбірае форму гістарычнага рамана, але напісаны ён пад значным уздзеяннем эстэтыкі постмадэрнізму, што праяўляецца ў складанай структуры твора, гульне з хранатопам, фрагментарнасці ў арганізацыі наратыва, маніпуляцыях з жанравымі характэрыстыкамі выхаваўчага, ваеннага, крымінальнага, эпісталярнага рамана, выкарыстанні элементаў тэорыі траўмы, інтэртэкстуальнасці, дэканструіраванні феномена радыёпрапаганды, якая адыграла такую важную ролю ў абалваньванні нямецкага народа ў 1930-я гады. Сам Дорр так растлумачыў абраны жанр: «Гісторыя вывучае, як, калі і дзе вялікая колькасць чалавечых асоб трапіла пад уздзеянне розных міфаў. А расказаць – гэта як бы сачыць за тым, як індывідуумы дзейнічаюць унутры гэтых гістарычных наратываў» [1, p. 16]. Асабліва небяспечна, калі міфы выкарыстоўваюцца для падпіткі нацыяналізма, што зноў стала актуальным у сёняшнім свеце. Пісьменнік звяртае ўвагу, што зараз «Інтэрнэт ужываецца для перадачы міфаў у значнай ступені таксама, як радыё выкарыстоўвалась у 1930–1940-я гады» [6, p. 6]. І не выпадкова ён выбірае ў якасці галоўных персанажаў падлеткаў, якім выпала жыць у страшныя гады ваеннага ліхалецця і якія вымушаны рабіць цяжкі маральны выбар, яшчэ не маючы ніякага жыццёвага вопыту. Тым самым пісьменнік развівае тэндэнцыю ў сучасным рамане паказу вайны вачыма падлетка (Б. Шлінк, Дж. Бойн, М. Фрэйн, А. Адамовіч, В. Казько і інш.). Міфы найбольш эфектыўна ўваходзяць ў свядомасць як раз ў гады фарміравання асобы, і яны найбольш жывучыя.

Загаловак рамана адразу дае вызначэнне асноўнай тэме кнігі – супрацьпастаўленню фізічна відушчых, але маральна сляпых, якія не разважаючы могуць выканаць любы загад, і фізічна сляпых, акім адкрыты свет, бо гэта маральна бездакорныя людзі, гатовыя служыць чалавеку, а не нейкай абстрактнай ідэе. А інструментам, які выкарыстоўваецца з процілеглымі мэтамі, з'яўляецца радыё: для адных людзей яно распаўсюджвае нацысцкую ідэалогію, для іншых яно дапамагае ў фарміраванні гуманістычных прынцыпаў. Гэтым тлумачыцца і структура рамана ў форме віньетак, якія развіваюцца паралельна і прысвечаны лёсам сляпой французскай дзяўчынкі Мары-Лор ЛеБланк і нямецкага хлопчыка Вернэра Пфеніга. Не выпадкова пісьменнік робіць галоўнымі героямі француженку і немца: Францыя і Германія прайшлі праз шэраг канфліктаў і войн, і толькі пасля Другой сусветнай вайны пры актыўным

удзеле канцлера К. Адэнаўэра адносіны паміж былымі ворагамі набылі іншы характар і сталі асновай будучага Еўрапейскага Саюза. У рамане Дорра героі, самі не ведаючы таго, цягнуцца адзін да аднаго, пераадольваючы гістарычную варожасць і нянавісць.

Дзеянне рамана пастаянна пераносіцца з 1940-х гадоў у 1930-я і зноў у 40-я і далей – у сёнешні дзень і назад, праводзячы сувязі паміж рознымі гістарычнымі перыядамі, як і паміж прычынамі гістарычных катаклізмаў і іх вынікамі. Першая глава называецца нулявой і дае дату «7 жніўня 1944», ад якой ідзе адлік часу назад і ўперад, а заканчваецца раман главой 13 (!) – «2014». Нулявая глава адсылае да двух галоўных герояў і месца дзеяння пад час амерыканскай бамбардзіроўкі маленькага нармандскага гарадка Сент-Мало на поўначы Францыі, дзе, не ведаючыя адзін аднаго, яны апынуліся побач. З гэтага моманту ўсе падзеі падаюцца з пункту гледжання Мары-Лор або Вернэра.

Кампазіцыйна раман напамінае кінастужку, калі камера то набліжаецца да героя і дае яго крупным планам, то з'яжджае ўбок. Самі главы вельмі простыя і кароткія. Няма доўгіх партрэтных ці пейзажных замалёвак; шмат даецца пункцірна, з даверам да чытача, яго інтуіцыі і фантазіі, але гэта такая прастата, якая захоплівае, не дае адарвацца ад кнігі, пакуль не перагорнута апошяя старонка. А потым – звонкая цішыня, калі трэба зноў і зноў абдумаць прачытанае. Вядомая татарская пісьменніца, уладальніца прэмій «Вялікая кніга» і «Ясная Паляна» Гузель Яхіна слушна сцвярджае: «Энтані Дорр не папавядае, а паказвае: выбудоўвае кадр, накіроўвае святло, знаходзіць бліскучыя рашэнні сцэн, манціруе, складвае эпізоды, сплятае іх у акты. Гэта моцнае аўтарскае кіно ў прозе; фільм, прыдуманы, пастаўлены і зняты – на паперы, адным аўтарам» [10, с. 251].

На працягу дзесяці глаў пісьменнік па чарзе паказвае падзеі ў жыцці дзяўчынкі і хлопчыка, як бы высвятляючы пражэктарам фігуру на авансцэне, а адначасова ідзе гісторыя паміраючага ад рака нямецкага афіцэра маёра фон Румпеля, які шукае легендарны алмаз «Мора Агня». Ён павінен дараваць яго ўладару бессмяротнасць, але нясе катастрофу для чалавецтва. Дзеянне з Парыжа 1930-х гадоў перамяшчаецца ў нямецкі шахцёрскі гарадок Цольверайн, потым у Парыж на пачатку вайны, а пазней у Сент-Мало, куды дабяруцца Мары-Лор з айцом пасля акупацыі Парыжа, і зноў у шахцёрскі гарадок, а потым у элітную ваенную школу Шульпфортэ, куды пасля цяжкіх іспытаў пападзе Вернэр з яго талентам радыёмайстра. Іх шляхі будуць ісці насустрач адзін аднаму, пакуль яны не сустрэнуцца пад час амерыканскіх бамбардзіровак Сент-Мало. Гэта будзе іх адзіная сустрэча, якая выратуе Мары-Лор. 10-я глава «12 жніўня 1944» заканчваецца на пачатку верасня смерцю Вернэра, які, трапіўшы ў лагер для ваеннапалонных, ідзе на месячнае святло, «серабрыстае і блакітнае, блакітнае і серабрыстае», «у накірунку Германіі, у накірунку дома» [5, p. 482], і падрываецца на міне. Тры апошнія главы пераносяць чытача ў 1945, 1974 і 2014 гады, апавядаючы пра тое, што здарылася з дзяўчынкай і тымі людзьмі, якія помнілі хлопчыка, – яго сястру Юту і таварыша па службе Фольксхаймера. А ў апошняй главе старая Мары-Лор ідзе на прагулку са сваім унукам Мішэлем і ўзгадвае і айца, і дзеда, і мадам Маэк, якая клапацілася пра

іх, і нямецкага хлопчыка Вернэра, і ёй здаецца, што душы людзей лунаюць над Ардэннам, і Рэйнам, і Бельгіяй, і «кожную гадзіну, думае яна, са света знікае хтосьці, для каго вайна была памяццю.

Мы ўзнімаемся зноў у траве. У кветках. У песнях» [5, p. 530]. І Мішэль абяцае, што ён зноў прыйдзе на наступным тыдні. Жыццё будзе працягвацца, нават калі нас не будзе. Але гэта ўжо іншае жыццё, бо дзякуючы электрамагнітным хвалям чалавецтва больш не асуджана на адзіноту; чалавек на адным канцы свету праз імгненне вока можа далучыцца да людзей за тысячы кіламетраў, як пра тое марыў нямецкі хлопчык Вернэр.

Да апошняга моманту ён будзе ўспамінаць незнаёмую французскую радыёстанцыю, на якой нейкі чалавек з аксамітавым голасам распавядаў пра электрамагітныя хвалі, аптычныя ілюзіі, а потым гучала цудоўная музыка, і знікала пачуццё часу і прасторы. І пад самы канец жыцця ён даведаецца, што гэта чалавек – дзед сляпой француженкі, які заканчваў кожную перадачу словамі: «*Адкрыйце вочы… і пабачце, што зможаце, перад тым як яны закрыюцца назаўсёды*, а потым піяніна пачынае іграць самотную песню, якая гучыць для Вернэра як залатая лодка, што плыве па цёмнай рацэ, прагрэсія гармоній, якая змяняе Цольферайн: дамы зніклі ў тумане, шахты засыпаліся, паваліліся трубы, старажытнае мора разлілося па вуліцах, і вольна гуляе вецер» [5, p. 48–49; курсіў – *A. D.*]. Дзякуючы радыё нямецкі хлопчык і яго сястра Юта, якія вечарамі слухаюць невядомага лектара, забываюцца пра мрак штодзённага жыцця ў сіроцкім прытулку і на нейкі момант апынаюцца ў цудоўным свеце музыкі і прыгажосці. А потым прыйдзе вайна, і радыёпрыёмнікі трэба будзе здаць, і слухаць можна будзе толькі гучнагаварыцель, які перадае праграмы германскага радыё, і замест перадач пра знакамітых стваральнікаў, вучоных, вынаходнікаў будзе ісці гаворка пра веліч Германіі, партыятызм і грамадзянскі абавязак кожнага арыйца, бо ўсіх чакае вялікая вайна. І таму перад сном «Дабранач, думае ён. Альбо *хайль* Гітлер. Усе выбіраюць апошняе» [5, p. 69. курсіў – *A. D.*].

Тэма радыё з'яўляецца адной з асноўных тэм рамана. Вядома, якую ролю яно адыграла ў маніпуляціі свядомасцю нямецкага народа. Адным з двух эпіграфаў да рамана сталі словы Й. Гебельса «Мы не змаглі бы ўзяць уладу і здзейсніць яе так, як мы зрабілі, без дапамогі радыё». Вернэр Пфеніг – не проста вундэркінд, захоплены тэхнічнымі магчымасцямі гэтага сродка камунікацыі, ён становіцца адэптам нацысцкіх прапагандысцкіх установак і ахвярай сваіх унікальных здольнасцей: пісьменнік робіць свайго персанажа спецыялістам па радыёпеленгацыі, і пры яго непасрэдным удзеле загіне мноства людзей, у тым ліку маленькая дзяўчынка ў лесе дзесь на Украіне, вобраз якой раз ад разу будзе ўзнікаць перад унутраным зрокам хлопца. Так яго талент робіцца яго праклёнам і ў рэшце рэшт прымушае Вернэра задумацца пра тое, што адбываецца вакол яго. Нездарма пісьменнік дае яму прозвішча Пфеніг: гэта была не толькі манета самай малой вартасці, але і выраблялася з самых танных матэрыялаў, якія хутка псаваліся. З такіх пфенігаў, не меўшых ніякіх магчымасцей прабіцца ў жыцці, у вялікай значнасці фарміравалася нямецкая

армія – для Вернэра адзіным спосабам не стаць шахцёрам, як яго бацька, што загінуў ў шахце, было пайсці ў войска.

Пачатак яго жыццёваму вандраванню кладзе талент адрамантаваць любы радыёпрыёмнік, нават без спецыяльных ведаў. Пасля таго, як Вернэр адрамантаваў радыё пану Зідлеру, аднаму з гітлераўскіх бонз, хлопчык атрымлівае рэкамендацыю да паступлення ў ваенную школу як раз таму, што ў хлопца няма грошэй, каб вучыцца. Там хлопцаў вучаць навейшым дасягненням у механіцы, узлому сакрэтных кодаў, рабоце ракетных рухавікоў і г. д., Зіглер падкрэслівае, што гэтая адукацыйная ўстанова накіравана на такіх, як Вернэр, хлопцаў: «У тым і геніяльнасць гэтых устаноў. Ім патрэбны рабочы клас, працавікі. Хлопцы, на якіх няма кляйма, – герр Зідлер нахмурыўся, – смецце сярэдняга класса. Кіно і гэтак далей. Ім патрэбны працавітыя хлопцы. Выключныя хлопцы» [5, p. 85]. Шчуплы, маленькі Пфеніг паспяхова праходзіць усе іспыты і становіцца вучнем Шульпфорты, не ведаючы, што там будзе зроблена ўсё, как ператварыть юных навучэнцаў ў гарматнае мяса з адзінай мэтай – быць у стане без роздуму выканаць любы загад фюрэра. Яго малодшая сястра Юта інтуітыўна разумее небяспечны накірунак развіцця Германіі, яна з'яўляецца духоўным камертонам і адразу не прызнае нацысцкую ідэалогію. але Вернэр спрабуе апраўдаць сябе пачуццём абавязка: «*Pflicht*. Гэта значыць доўг. Абавязак. Кожны немец, які выконвае сваю функцыю. Надзень боты і ідзі працуй. Ein Volk, ein Reich, ein Fuhrer. Кожны з нас павінны іграць сваю ролю, сястрычка [5, p. 124–123; курсіў – *A. D.*]. Ён выканае тое, што патрабуе ад яго фюрэр, як гэта будуць рабіць і мільёны немцаў, але перад тым яму прыйдзецца пазнаць страх, здзекі, хлусню, здрадніцтва, бо толькі такім чынам можна прымусіць людзей забыцца пра чалавечую годнасць і зрабіць з чалавека робат для ажыццяўлення чалавеканенавісніцкіх планаў, дзе больш моцны здзекваецца са слабага, а ўсё інакавае не мае права на існаванне. «Вы будзеце сілкавацца краінай і дыхаць нацыяй», – прапаведуе аднарукі наглядчык інтэрната [5, p. 137]. Ён нават параўноўвае вучняў з градам куль: усе павінны ляцець ў адным напрамку, насустрач адзінай мэце, не ведаючы сумненняў, бо сумненне – гэта адзнака слабасці, а немец не можа быць слабым. Як у любой таталітарнай сістэме, усе павінны быць падобнымі адзін да аднаго, упор робіцца на аднолькавасць, усярэдненасць, а любыя формы інакавасці не только нівеліруюцца, але і знішчаюцца.

Такім інакшым, не падобным да чатырохсот вучняў Шульпфортэ быў сын дыпламата Фрэдэрык, «кволы хлопчык, тонкі, як травінка» [5, p. 137], марай якога была арніталогія; замест таго, каб вучыць на памяць нацысцкія вершы і маршы, ён сачыў за палётам птушак, якія ўзнімаліся далёка ў неба, і хлопчык як бы ляцеў за імі, у той час як на школьнай пляцоўцы з факеламі і флагамі са свастыкай маршыруюць дзесяцігодкі; яны співаюць песню пра тое, што гатовы памерці смерцю героя на ахвярнай зямлі. Ў адрозненне ад Вернэра ён не можа прызвычаіцца да норм жыцця і паводзін у школе; у думках Фрэдэрык – у свеце птушак, паэзіі, музыкі, і таму ён не можа пагадзіцца са здзекамі, якія выкарыстоўваюцца, каб заглушыць чалавечае ў вучняў і выклікаць у іх жывёльныя інстынкты. З гэтай мэтай рэгулярна праводзіцца забег, пад час

якога вышукваецца найслабейшы з вучняў, а потым гэты хлопчык вымушаны зазнаць фізічнае і маральнае насілле. Фрэдэрык адмаўляецца браць удзел ў здзеках і не прызнае сябе найслабейшым, г. з. «недачалавекам», тым самым выносячы сабе прысуд. Вернэр заплюшчвае вочы, каб не бачыць жудаснай сцэны, але не вырашаецца адкрыта падтрымаць сябра, хаця і разумее агіднасць таго, што робіцца навокал. Я. Рыц слушна заўважыла, што «ў рамане Энтані Дорра ставіцца пытанне пра меру калектыўнай і індывідуальнай віны ў гістарычных злачынствах» [2, с. 208]. Але гэта яшчэ і калектыўная траўма, якая кожным адчуваецца па-рознаму. Вернэр неаднаразова вяртаецца ў мінулае, спрабуючы разбурыць страшэнную сучаснасць. Натуральна, падлетак яшчэ не ведае ўсю меру дабра і зла, але ён не можа не адчуваць несправядлівасці сістэмы, накіраванай на дасягненне сусветнага панавання.

Прасвятленне не прыйдзе адразу; яго чакаюць новыя і новыя выпрабаванні і мора крыві. Ён бачыць, што чакае найслабейшага, прысутнічае пры расправе над украінскімі партызанамі, на след якіх яго каманда выйшла дзякуючы яго таленту радыёпеленгатара, прыязджае да свайго адзінага сябра Фрэдерыка, які пасля здзекаў жыве ў іншай прасторы, дзе няма «ні скандзіравання ні спеваў ні шоўкавых сцягаў ні аркестраў ні труб ні маці ні бацькі ні камендантa з ліпкімі пальцамі які праводзіць пальцам па яго спіне» [5, p. 297; правапіс А. Д. – *Ю. С.*]… Але аднойчы наступае момант, калі ужо будзе не магчыма заплюшчваць вочы на жахи и зверства вайны, і ён не выканае свой абавязак, калі запеленгуе радыёперадатчык, які працуе ў доме № 4 па вуліцы Вобарэль. Гэта той дом, з якога надаваліся цудоўныя праграмы для дзяцей. З іх пачалося яго захапленне навукай і радыё. І Вернэр прыйдзе ў гэты дом і выратуе сляпую дзяўчынку, якая са страхам чакае, калі на шосты паверх дабярэцца нямецкі афіцэр у пошуках дыяманта. А дзяўчынка вельмі простымі словамі растлумачыць яму сэнс жыцця: «Калі я страціла зрок, Вернэр, людзі казалі, што я смелая. Калі знік мой бацька, людзі казалі, што я смелая. Але гэта не смеласць; у мяне няма выбару. Я прачынаюся і жыву сваім жыццём. А ці ты не робіш тое самае?

Ён кажа: «Шмат гадоў – не. Але сёння. Сёння, мабыць, і так» [5, p. 469].

Вялікую ролю ў рамане адыгрываюць інтэртэкстуальныя сувязі, у першую чаргу з раманам Ж. Верна «Дваццать тысяч лье пад вадой». Мары-Лор атрымала першую частку ў падарунак ад бацькі яшчэ ў мірныя дні. Кніга суправаджае яе праз усю вайну. У крытычныя моманты яна ўзгадвае капітана Нэма і яго апошнія словы: «Мы памрэм разам, сябра мой Нэд» [5, p. 446], і гэта дае ёй сілу не здавацца, нават калі яна апынулася адна, сляпая, у палаючым мястэчку. Раман адкрывае для сляпой дзяўчынкі дзіўны свет фантазій, прыгод і выпрабаванняў чалавечага духа, и таму ёй так падабаецца хадзіць на бераг мора слухаць шалясценне хваляў, збіраць малюскаў і марыць пра мора. Капітан Нэма, загадкавая асоба, што прыходзіць на дапамогу народам прыгнечаных краін, – яшчэ і даследчык таямніц мора. І як дэвізам яго падводнай лодкі «Наўцілус» з'яўляецца «Mobilis in mobili» (Рухаючыйся ў рухомым), так і пісьменнік гуляе з пошукам нябачнага ў бачным, матэрыяльнага ў духоўным і наадварот. Яе цікавасць да марской біялогіі супастаўляецца з захапленнем

хлопчыка радыё; іх жыццё магло скласціся інакш, але вайна радыкальным чынам змяніла іх лёс. Ён ніколі не даведаецца, на што здатная сучасная навука; яму не дано пазнаць каханне, а сляпая жанчына захавае памяць пра нямецкага хлопца, які выратаваў яе. Вайна яшчэ вельмі доўга будзе адгуквацца ў жыцці не толькі тых, хто непасрэдна перажыў яе, яле і іх нашчадкаў. І тэхналагічны прагрэс, які мог бы спрыяць больш камфортнаму жыццю людзей у розных частках света, зноў і зноў выкарыстоўваецца ў імя зла, трыумфа сілы, і маленькіх пфенігаў зноў адурманьваюць прапагандай, і зноў яны ідуць «выконваць свой абавязак». У 1943 годзе Б. Брэхт напісаў «Бараноў марш» (Kälbermarsch), які застаецца актуальным і сёння:

«Der Metzger ruft. Die Augen fest geschlossen
Das Kalb marschiert mit ruhig festem Tritt.
Die Kälber, deren Blut im Schlachthof schon geflossen
Sie ziehn im Geist in seinen Reihen mit» [3].

Расійскі крытык А. Песцярэва называе раман «сентыментальным» [7]. Здаецца, што ёй не удалося пранікнуць па-за прастату доррараўскага стылю. Гэта нязвыклая, падманная прастата, за якой схаваны моцны па думцы і напружанасці змест. Сціпла напісаны раман Энтані Дорра заклікае не забываць урокі гісторыі: мінулае мае звычку помсціць за беспамяцтва. Найвышэйшыя дасягненні навукі і тэхнікі могуць аднолькава як служыць людзям, так і знішчаць усё, што яны будавалі на працягу тысячагоддзяў.

## ЛІТАРАТУРА

1. A Q&A : with the 2015 winners of the Andrew Carnegie medals for excellence in fiction and nonfiction : [interviews with authors Anthony Doerr] // American Libraries. – 2015. –Vol. 46. – No. 7–8. – P. 16.
2. Книжная полка Евгении Риц // Новый мир. – 2015. – № 5. – С. 207–208.
3. Brecht, B. (1943), "Calf march" ["Kälbermarsch"], available at: https://sites.google.com/site/ernstbush/pesni-i-ih-istoria-mp3-file-1/spisok/baranij-mars-1943
4. Chetty L. Lost Youth / L. Chetty // America. – 2014. – Sept. 1. – P. 38
5. Doerr A. All the Light We Cannot See / Anthony Doerr. – New York : Scribner, 2015. – 531 p.
6. Hooper B. The Booklist Carnegie Medal Interview, fiction : Anthony Doerr / B. Hooper // Booklist. – 2015. – July 1. – P. 6.
7. Пестерева Е. Сто бед и десять историй : Заметки / Е. Пестерева // Юность. – 2016. – № 6. – Режим доступа: http://magazines.russ.ru/nov_yun/2016/6/sto-bed-i-desyat-istorij.html
8. Schulman M. How the Story Comes Together / M. Shulman // Publishers Weekly. – 2014. – April 14. – P. 26.
9. Vaill A. «All the Light We Cannot See», by Anthony Doerr / A. Vaill // The Washington Post. – 2014. – May 5. – available at: https://washingtonpost.com/entertainment/books/all-the-light-we-cannot-see-by-anthony-doerr/2014/05/05/c2deec
10. Яхина Г. Внутренние «галочки» / Г. Яхина // Дружба народов. – 2016. – № 1. – С. 251–252.

## REFERENCES

1. (2015), "A Q&A: with the 2015 winners of the Andrew Carnegie medals for excellence in fiction and nonfiction", interviews with authors Anthony Doerr, *American Libraries*, Vol. 46 No. 7-8, p. 16. (in English).

2. (2015), "Bookshelf Eugene Ritz" ["Knizhnaya polka Evgenii Ric"], *Novyi mir*, No. 5, pp. 207-208. (in Russian).
3. Brecht, B. (1943), "Calf march" ["Kälbermarsch"], available at: https://sites.google.com/site/ernstbush/pesni-i-ih-istoria-mp3-file-1/spisok/baranij-mars-1943 (in German).
4. Chetty, L. (2014), "Lost Youth", *America*, Sept. 1, p. 38. (in English).
5. Doerr, A. (2015), *All the Light We Cannot See*, Scribner, New York, 531 p. (in English).
6. Hooper, B. (2015), "The Booklist Carnegie Medal Interview, fiction", *Booklist*, July 1, p. 6. (in English).
7. Pestereva, E. (2016), "One hundred and ten stories of troubles: Notes" ["Sto bed i desyat istorij: Zametki"], *Yunost*, No. 6, available at: http://magazines.russ.ru/nov_yun/2016/6/sto-bed-i-desyat-istorij.html (in Russian).
8. Schulman, M. (2014), How the Story Comes Together, *Publishers Weekly*, April 14, p. 26. (in English).
9. Vaill, A. (2014), "'All the Light We Cannot See', by Anthony Doerr", *The Washington Post*, May 5 – available at: https://washingtonpost.com/entertainment/books/all-the-light-we-cannot-see-by-anthony-doerr/2014/05/05/c2deec
10. Yakhina, G. (2016), "Internal 'checkmarks'" ["Vnutrennie galochki'"], *Druzhba narodov*,. No. 1, pp. 251-252. (in Russian).